УДК 94(476)«1850/19»:323.3-051

В. М. Астрога, дацэнт

# ФАРМІРАВАННЕ НАСТАЎНІЦТВА ЯК САЦЫЯЛЬНАЙ ГРУПЫ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX – ПАЧАТАК XX СТСТ.)

The article states thot the major part of Belarusian intellectuals in the second half of the XIX – at the beginning of the XX centuries were teachers. It dwells upon their age, gender, social and national characteristics and studies tendencies of their change. The article draws the conclusion that the main peculiarities proper to the teachers of that period are an insufficient level of pedagogical education, young age and lack of experience. The educational level of the teachers of elementary (public and church-parish) and secondari educational institutions is studied bn the article.

**Уводзіны.** У другой палове XIX – пачатку XX стст. вясковае настаўніцтва, якое складала большую частку педагагічнай інтэлігенцыі ў Беларусі, сфарміравалася як сацыяльная група. Яно іграла асобую ролю ў жыцці грамадства. Менавіта ў гэты час, нягледзячы на кансерватыўную палітыку царызму, узнікалі спецыяльныя педагагічныя навучальныя ўстановы. Настаўніцтва стала ўсведамляць сваё месца сярод іншых работнікаў разумовай працы, зрабіла першыя спробы прафесійнага аб'яднання, правядзення сваіх з'ездаў і нарад. Незадаволенае сваім грамадскім статусам, яно пачало барацьбу за паляпшэнне матэрыяльнага і прававога становішча.

**Асноўная частка.** Гістарычны вопыт паказвае, што галоўнай фігурай любой навучальнай установы заўсёды быў настаўнік. Ад яго ўзроўню ведаў, уменняў і навыкаў залежала і якасць навучання, і ступень культурнага ўплыву школы на грамадства. Праца настаўніка не абмяжоўвалася толькі выкладаннем прадметаў, а ахоплівала амаль усе сферы гарадскога і сельскага ўкладу жыцця.

У адукацыйным узроўні настаўнікаў назіралася вялікая розніца. Спецыяльную адукацыю мелі выкладчыкі, якія скончылі настаўніцкія семінарыі і педагагічныя курсы. Агульную адукацыю мелі выпускнікі сярэдніх навучальных устаноў. З універсітэцкімі дыпломамі ў вясковай школе працавалі, зразумела, адзінкі. Адукацыя, ніжэйшая за сярэднюю, была ў тых, хто закончыў царкоўна-настаўніцкія і другакласныя школы, а таксама хто атрымаў пасведчанне на званне настаўніка экстэрнам.

У 60-я гг. XIX ст. настаўніцкія пасады ў асноўным былі заняты асобамі духоўнага сану. Апякун Віленскай навучальнай акругі І. Карнілаў у сваёй справаздачы прывёў такія даныя аб складзе настаўнікаў на 1 студзеня 1864 г.: святароў – 362, святароў законанастаўнікаў – 218, дыяканаў – 30, псаломшчыкаў – 63, выхаванцаў духоўных семінарый – 116, валасных пісараў, якія скончылі семінарыі і духоўныя вучылішчы, – 8, без атэстатаў – 24, асоб жаночага полу – 17.

Адпаведна выглядаў адукацыйны ўзровень працаваўшых у царкоўнапрыходскіх школах Мінскай епархіі. У 1890/91 навучальным годзе са 180 настаўнікаў 41 былі членамі прычта, 78 асоб скончылі сярэднія навучальныя ўстановы і семінарыі, у тым ліку 52 настаўніцы – выхаванкі жаночых епархіяльных вучылішчаў. У астатніх адукацыя была ніжэй за сярэднюю. У школах пісьменнасці з 1119 настаўнікаў 1079 «адукацыю» атрымалі ў народных вучылішчах і царкоўнапрыходскіх школах.

У межах Расійскай імперыі ў 1880–1890-я гг. адукацыйны ўзровень настаўнікаў быў невысокі. Асоб, якія прайшлі спецыяльную падрыхтоўку, было 25% сярод настаўнікаў і 8% сярод настаўніц. Улічваючы тых, хто атрымаў адукацыю ў духоўных семінарыях і жаночых гімназіях, агульная колькасць настаўнікаў, знаёмых з педагогікай, складала 35,9% [1, с. 56].

У новым стагоддзі назіраўся пік росту школ духоўнага ведамства. Так, у 1906 г. у Віцебскай губерніі з 287 настаўнікаў 109 былі з сярэдняй і спецыяльнай адукацыяй, 4 без адукацыйнага цэнзу, а астатнія настаўніцкае званне атрымалі па нескладаных іспытах. Св. Сінод, які раней крытыкаваў народныя школы і настаўніцкія семінарыі, у гэтай сувязі рабіў пэўныя крокі, каб дасягнуць узроўню міністэрскіх вучылішчаў. У дырэкцыі з епархіяльных саветаў прыходзілі запыты на настаўнікаў, у першую чаргу на выхаванцаў семінарый, прасілі рэкамендаваць здольных, у маральна-рэлігійных адносінах добранадзейных кандыдатаў на пасады настаўнікаў. У 1907 г. у вясковых школах Віленскай навучальнай акругі па адукацыйным цэнзе трое, ці 0,08% ад усіх настаўнікаў, былі з вышэйшай адукацыяй, 1760 асоб, ці 51%, атрымалі спецыяльную падрыхтоўку, 1658, ці 48,24%, – з сярэдняй і пачатковай, а 20, ці 0,68%, не мелі настаўніцкага звання.

На 1 студзеня 1915 г. у школах Віленскай навучальнай акругі працавалі настаўнікі, якія па адукацыйным ўзроўні размяркоўваліся так: са спецыяльнай адукацыяй – 2800, з сярэдняй і званнем пачатковага настаўніка – 1768, без адукацыйнага цэнзу – 49 чалавек. Сярод настаўніц 3 мелі вышэйшую адукацыю, са спецыяльнай падрыхтоўкай было 931, з сярэдняй і са званнем пачатковай настаўніцы – 3349, а без адукацыйнага цэнзу – 38 чалавек [2, с. 39]. З прыведзеных даных бачна, што лік педагогаў, што

не мелі пасведчанняў (87), складаў невялікую частку агульнай колькасці (8938), большасць настаўнікаў валодала спецыяльнай адукацыяй, а настаўніц – сярэдняй.

У цэлым, склад настаўнікаў пачатковых школ Беларусі на той час больш-менш задавальняў патрэбы народнай асветы. Адукацыйны ўзровень выкладчыкаў сярэдніх навучальных устаноў Расіі быў значна вышэйшы. З 10 тысяч палова мела вышэйшую адукацыю, настаўніцы гімназій – сярэднюю. Адукацыйны ўзровень вясковых настаўнікаў у першыя гады Савецкай улады істотна не змяніўся: сярод 5777 чалавек вышэйшую адукацыю мелі толькі адзінкі. Большасць з іх працавала з дарэвалюцыйным стажам.

У 1860-я гг. настаўнікамі ў школах былі амаль адныя мужчыны. У наступнае дзесяцігоддзе ў пачатковых вучылішчах пачалі з'яўляцца настаўніцы, выхаванкі жаночых гімназій і епархіяльных вучылішчаў. Асаблівае імкненне прыцягнуць на працу настаўніц назіралася ў земскіх губернях Расіі, дзе за аднолькавую працу з мужчынамі жанчыны атрымлівалі значна менш. У 1880 г. у Віленскай акрузе працавалі 20,9% настаўніц, прычым больш за ўсё ў Магілёўскай губерні – 37,8%, і сама мала ў Гродзенскай – 7,8% [3, с. 12].

Па афіцыйных даных, у 1898 г. па 50 губернях Расіі настаўніц пачатковых вучылішчаў Міністэрства асветы было 47%. Па Віленскай навучальнай акрузе настаўніцы складалі толькі каля 30% ад агульнай колькасці настаўнікаў, у Мінскай губерні – 34%, Віцебскай – 33%, Віленскай – 30%, Магілёўскай – 28%, Гродзенскай – 22%. Усіх настаўнікаў пачатковых народных вучылішчаў было 2684, з іх 793 настаўніцы. Ніжэйшай, чым у Віленскай акрузе, колькасць настаўніц была толькі ў Прыбалтыцы, Царстве Польскім, Валынскай і Падольскай губернях. Гэта можна растлумачыць адсутнасцю спецыяльных педагагічных жаночых навучальных устаноў і пэўнай колькасцю настаўнікаў з цэнтральных губерняў Расіі. У адрозненне ад настаўнікаў-мужчынаў, вясковыя настаўніцы не затрымліваліся ў школе: выходзілі замуж і пакідалі яе, а ў некаторых расійскіх губернях гэта патрабавалася ад іх у законным парадку. Але і ў іх асяроддзі заставаліся тыя, хто школьнай справе прысвячалі ўсё сваё жыццё.

У 1907 г. па Віленскай акрузе ў народных школах працавалі 2404 настаўнікі (прыкладна 70%) і 1037 настаўніц (каля 30%.) У параўнанні з папярэднім годам назіралася тэндэнцыя павелічэння жанчын-педагогаў на 37,5% [4, с. 348]. У пачатковых школах ведамства Св. Сінода на 1908 г. працавала 3847 настаўнікаў, ці 76% ад агульнай колькасці, і 1244 настаўніцы – 24%. Такім чынам, у дадзеныя гады колькасць педагогаў-настаўніц была нязначнай па двух ведамствах.

Колькасны рост настаўніц дазваляюць прасачыць статыстычныя даныя па Віцебскай губерні. Калі ў 1904 г. з 302 педагогаў іх было 113, ці 37% , то ў 1912 г. з 1593 асоб іх было ўжо 897, ці 56%. У міністэрскіх школах пераважалі настаўнікі, а ў земскіх і царкоўнапрыходскіх – настаўніцы. Калі разглядаць даныя па асобных паветах, то з 11 толькі ў 3 колькасць мужчын нязначна пераважала над жанчынамі, а ў астатніх працэнт настаўніц вагаўся ад 53 да 71, дасягаючы найбольшых лічбаў у Віцебскім, Невельскім, Дрысенскім і Веліжскім паветах.

У царкоўнапрыходскіх школах Віцебскай губерні ў 1906 г. працавалі 226 настаўніц і толькі 61 настаўнік. Па нашых падліках, у пераважнай большасці царкоўных школ Мінскай епархіі ў тым жа годзе пачатковая адукацыя знаходзілася ў руках жанчын: у Навагрудскім павеце з 40 выкладчыкаў – 32 настаўніцы, у Бабруйскім з 27 – 20, у Мінскім з 24 – 19.

У 1915 г. у пачатковых вучылішчах розных тыпаў працавалі 4617 мужчын і 4321 жанчына. Па Расіі напярэдадні вайны настаўніцкі персанал пачатковых школ складаўся з 71 430 настаўнікаў і 115 030 настаўніц. Як бачна, паступова колькасць жанчын-выкладчыц не толькі ўраўнялася з мужчынамі, але і перавысіла іх. За мяжой, напрыклад, у Англіі, ў гэты час таксама адзначаўся працэс выцяснення настаўнікаў пачатковых школ настаўніцамі. У 1860-я гг. з 5 сельскіх школ у 4 выкладалі мужчыны, у 1870-я гг. лік адных і другіх быў прыкладна аднолькавы. У пачатку XX ст. з 6 школ у 5 працавалі настаўніцы. Такая ж з'ява назіралася і ў ЗША [5, с. 233].

Сацыяльны склад настаўнікаў у пачатковых школах Беларусі быў разнастайны як адносна іх узроўню развіцця і адукацыі, так і адносна іх звання і паходжання. Як ужо адзначалася, з самага пачатку ўзнікнення народнай школы настаўнікамі ў іх былі амаль толькі святары і семінарысты. Іншых настаўнікаў, калі не лічыць выпадковых, не было. У першай палове XIX ст. былі і настаўнікі-дваране. Так, у Азяранскай школе (25 км ад Рагачова) да 1870 г. настаўнікамі былі толькі шляхціцы, якія мелі маёнткі з «прыгоннымі душамі». Як паведамляў святар М. Радзевіч, у сельскіх школах «ёсць духоўныя, дваране, мяшчане, ваенныя, сяляне, ёсць адстаўныя, палкоўнікі, маёры, прыняўшыя праваслаўную веру палякі і асобы, склаўшыя з сябе святарства і манаскае званне» [6, с. 68]. У наступныя гады лік асоб духоўнага сану і асабліва настаўнікаў-святароў значна паменшыўся.

Калі прааналізаваць даныя аб сацыяльным складзе народных школ Расіі пазнейшага перыяду, то высвятляецца, што ён быў у асноўным дробнабуржуазным. У 1880 і 1911 гг. дваране складалі 10,9 і 6,7%, асобы духоўнага звання – 37,8 і 22%, сяляне (у асноўным з заможных

сямей) – 30,2 і 40,8%, мяшчане – 10 і 17%, іншыя – 11 і 13,3%. Такім чынам, гэта былі ў асноўным выхадцы з заможнага сялянства, дробнай гарадской буржуазіі і духавенства.

Сярод настаўніц 22% складалі дочкі асабовых і 8% – спадчынныя дваране, 44% – духавенства і ўсяго 7% з сялян [7, с. 163]. У дачыненні да настаўніц больш пазнейшая статыстыка ў асноўным пацвярджала гэтую карціну. У 1910-я гг. асяроддзе настаўніц папаўнялася выхадцамі з сялян, сельскага духавенства, а таксама дробных чыноўнікаў. Сацыяльнае паходжанне настаўніц Віленскай акругі з 1880 да 1911 гг. значна змянілася: з дваран з 23,8 да 15,2%, духоўнага звання адпаведна з 68,5 да 31,5%, сялян з 1,2 да 23,7%, мяшчан з 3,7 да 16,4%, іншых з 2,8 да 13,2%. Калі ўзяць для прыкладу Віцебскую губерню, то па саслоўным складзе ў новым стагоддзі ў земскіх і міністэрскіх школах пераважалі сяляне і мяшчане – звыш 60%, а ў царкоўнапрыходскіх асобы духоўнага звання складалі 37,5%. У Лідскім павеце Гродзенскай губерні ў 1911 г. працавалі 8 чалавек з дваран, 17 з мяшчан, 6 з духоўнага саслоўя, 55 сялян і 12 чалавек з іншых саслоўяў.

У Беларусі напярэдадні вайны настаўнікамі былі: 7% з дваран, 13,2% з духоўнага звання, 61% з сялян, 12% з мяшчан і 6,8% іншых саслоўяў.

Такім чынам, назіралася тэндэнцыя скарачэння колькасці настаўнікаў з дваран і духавенства і павелічэння з сялян і мяшчан. У многім гэта тлумачылася ростам сеткі педагагічных навучальных устаноў, выхаванцы якіх па паходжанні ў асноўным адносіліся да ніжэйшых саслоўяў. Па сваім сацыяльным складзе настаўнікі за мяжой, напрыклад, у Англіі і Францыі, былі выхадцамі з сярэдніх і бяднейшых слаёў: дробных фермераў, гандляроў, рамеснікаў.

Настаўніцтва ніколі не было аднастайнай масай. Расслаенне ішло не толькі па адукацыйным узроўні і сацыяльным паходжанні, але і па тым, да якога слоя мясцовага насельніцтва далучаліся настаўнікі. Некаторыя, асабліва сярод настаўніц, якія скончылі сярэднія навучальныя ўстановы, і ў школах заставаліся «панамі і барынямі». Яны лічылі сябе культурнымі адзіночкамі, а іх кампанію складалі, напрыклад, мясцовыя памешчыкі ці ўрачы. Другія, у асноўным выхаванцы настаўніцкіх семінарый, далучаліся да сярэдняга класа: вясковы святар, крамнік, пісар, старшыня. Гэтыя настаўнікі, самі ў сваёй большасці выхадцы з народа, па-асобаму адносіліся да сялян. Вызваленыя ад рэкруцтва, натуральных павіннасцяў, выхадцы з «сялянскай акадэміі» (іншы раз так называлі настаўніцкія семінарыі), яны ў сваёй большай частцы звысоку ставіліся да свайго ранейшага грамадства: «шапка з кукардай, некаторая фанабэрыстасць і скорая пакрыўджанасць, модныя словы ў размове». Значны кантынгент выкладчыкаў складалі тыя, хто выйшаў з сялянскага асяроддзя і не хацеў з ім парываць. Яны настаўнічалі ў сваім павеце ці вёсцы і нічым амаль не адрозніваліся ад мясцовых жыхароў у сваіх светапоглядах і ладзе жыцця, хоць па адукаванасці знаходзіліся вышэй за іх.

Да рэвалюцыі 1905–1907 гг. рознымі пастановамі і законамі забаранялася дапускаць да педагагічнай дзейнасці асоб неправаслаўнай веры. Аб'явіўшы беларусаў «исконно русскими», самаўладдзе не прызнавала і беларускай мовы. Паводле Першага Ўсерасійскага перапісу насельніцтва 1897 г., толькі 20% настаўнікаў беларускіх губерняў лічылі сябе беларусамі. Нават сярод медыцынскіх работнікаў колькасць беларусаў была большай – 26%. У кіруючых колах цвёрда ўмацаваўся стэрэатып, што беларусы не з'яўляліся самастойнай нацыяй, а былі толькі этнаграфічнай галіной рускага народа, якая павінна была з ім зліцца. У 1910-я гг. выкладчыцкі персанал, напрыклад, Віцебскай губерні складаўся амаль выключна з рускіх (сюды ўваходзілі і беларусы) – 95,6% і праваслаўных – 97,5%. Наступнай групай былі латышы (65 чалавек) – 4,2%, з іх палова была праваслаўных і палова лютэран. У Веліжскім павеце гэтай губерні ў 1908 г. настаўнічалі ўсе рускія і праваслаўныя [8, л. 2]. У Лідскім павеце Гродзенскай губерні ў 1908 г. выкладалі 92 праваслаўныя і 6 іўдзейскага веравызнання. Але ўжо ў 1918 г. па Мінскай губерні ў анкетах з апытаных 42 вясковых настаўнікаў беларусамі ўжо назвалі сябе 34.

Па ўзросце большасць настаўнікаў належала да моладзі. У 1880 г. сярод мужчын у школах ва ўзросце да 30 гадоў працавала каля 77%, у 1911 г. – 70%, сярод жанчын – 87% і 81%. Вялікая колькасць іх выкладала ва ўзросце 21–25 гадоў. У 1880 г. большасць настаўнікаў (54%) і амаль усе настаўніцы (90%) былі ў ліку асоб, якія не знаходзіліся ў шлюбе. І ў пачатку ХХ ст. ва ўсіх беларускіх губернях 3/4 усяго выкладчыцкага персаналу складалася з халастых настаўнікаў і незамужніх настаўніц. Па даных на 1903 г., у Гродзенскай епархіі сярод 347 настаўнікаў царкоўнапрыходскіх школ халастых настаўнікаў было 234 і 76 незамужніх, у шлюбе адпаведна знаходзіліся 31 настаўнік і 3 настаўніцы.

Аналагічная карціна назіралася і ў Магілёўскай епархіі. З 546 выкладчыкаў нежанатых было 275 і 178 незамужніх, у шлюбе знаходзіліся 81 настаўнік, толькі 1 настаўніца і 11 чалавек было ўдовых [9, с. 86, 88]. Параўноваючы паказчыкі 1880 і 1911 гг. па Віленскай акрузе, бачна, што колькасць халастых сельскіх настаўнікаў павялічылася з 65,9 да 67,4%, а замужніх настаўніц – з 1,1 да 1,3%. Статыстычныя даныя дазваляюць сцвярджаць, што, як і раней, сямейных сярод выкладчыкаў была вельмі нязначная колькасць.

Пры цяжкай і матэрыяльна незабяспечваючай працы многія настаўнікі пачатковых школ не вытрымлівалі працяглых тэрмінаў службы. Нямецкія публіцысты, якія наведалі ў канцы 1890-х гг. некаторыя раёны Расіі, побач з сялянскім жыццём убачылі пастаянна галадаючых педагогаў, заўважылі, што, «каб быць у Расіі народным настаўнікам, трэба шмат ідэалагічнага самаахвяравання» [7, с. 170]. Найбольшая змена кадраў была сярод настаўнікаў, якія скончылі духоўныя семінарыі. Яны заўсёды маглі знайсці сабе іншую працу. Даўжэй за ўсіх трымаліся выпускнікі настаўніцкіх семінарый, якія мэтанакіравана рыхтаваліся да педагагічнай працы. Іх трымала і тое, што яны павінны былі адпрацаваць у школе 5 год альбо выплаціць грошы, затрачаныя ў якасці стыпендыі падчас вучобы. Больш пастаяннымі былі настаўнікі з сялян, змалку прывыклыя да вясковага жыцця.

У справаздачы аб царкоўнапрыходскіх школах Мінскай епархіі за 1890/91 навучальны год адзначалася, што большая частка служыць год, два, тры гады. Асоб, адпрацаваўшых больш за ўказаны тэрмін, было толькі некалькі дзесяткаў. Так, з ліку 170 настаўнікаў праслужылі 1 год 56 чалавек; 2 – 37; 3 – 24; 4 – 17; 5 – 14; 6 – 17; 7 і больш – 4 чалавекі. Былі ўказаны нават прозвішчы гэтых «герояў»: С. Мікульскі з Выдрынскай школы, В. Шыран з Паручынскай, І. Спікор з Ясенецкай і Г. Пятроў з Ляшчанскай [10, с. 59].

У 1906 г., па даных Магілёўскай губернскай управы, у земскіх школах не праслужыўшых менш за 5 год было 47%, ад 5 да 10 – 24%. У 1912 г. па Віцебскай губерні сярэдняя працягласць працы для настаўнікаў была 6,7 года, а для настаўніц – 6,1 года. У Магілёўскай епархіі ў 1913 г. ва ўсіх паветах пераважная колькасць працавала першае дзесяцігоддзе, а самы працяглы 20-гадовы стаж службы з 513 чалавек мела толькі 16.

Да пачатку 1914/15 навучальнага года ў сельскай мясцовасці Беларусі былі 1173 земскія школы пры 1403 настаўніках і 220 пачатковых школ Міністэрства народнай асветы пры 220 настаўніках. Але многія з іх так і не пачалі працу. Першая сусветная вайна стала прычынай таго, што пачатковая школа была напалову разбурана і зачынена. Большасць народных настаўнікаў была прызвана ў дзеючую армію.

**Заключэнне**. Такім чынам, настаўніцтва складала значную частку інтэлігенцыі Беларусі. Малады ўзрост, недастатковы ўзровень адукацыі і кароткачасовасць педагагічнай дзейнасці – асноўныя рысы педагагічнага корпуса другой паловы XIX – пачатку XX стст. Настаўніцтва не з’яўлялася аднародным па сваім сацыяльным складзе: былі выхадцы з дваран, духавенства, мяшчан і сялян. Толькі 20% настаўнікаў лічылі сябе беларусамі. З 1880-х гг. назіраецца тэндэнцыя росту колькасці жанчын-настаўніц. У цэлым, на працягу ўсяго разглядаемага перыяду адчуваўся востры недахоп педагагічных кадраў для імкліва растучых патрэб народнай адукацыі Беларусі.

## Літаратура


1. Фальборк, Г. Народное образование в России. Исторический очерк / Г. Фальборк, В. Чарнолуский. – СПб.: изд-во Попова, Б. г. – 264 с.
2. Отчет о состоянии учебных заведений и учреждений Виленского учебного округа за 1914 г. – Вильна: тип. А. Г. Сыркина, 1914. – 787 с.
3. Однодневная перепись начальных школ в империи, произведенная 18 января 1911 г. Выпуск VIII. Виленский учебный округ. – СПб.: тип. Тов-ва Екатерингофское Печатное Дело, 1914. – 134 с.
4. Начальные школы Северо-Западного края в 1907 г. // Народное образование в Виленском учебном округе. – 1908. – № 9. – С. 345–354.
5. Учительницы в Англии и Америке // Народное образование в Виленском учебном округе. – 1907. – № 5–6. – С. 233–236.
6. Родевич, М. Белорусские народные школы / М. Родевич. – Б. м., б. г. – 119 с.
7. Лейкина-Свирская, В. Р. Интеллигенция в России во второй половине XIX века / В. Р. Лейкина-Свирская. – М.: Мысль, 1971. – 368 с.
8. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Фонд 2507. Дырэкцыя народных вучылішчаў Віцебскай губерні. – Воп. 1. – Спр. 3637.
9. Исторический очерк развития церковных школ за истекшее двадцатипятилетие (1884–1909) – СПБ: Синодальная тип., 1909. – 686 с.
10. Отчет о церковно-приходских школах и школах грамоты Минской епархии за 1890/91 учебный год. – Минск: тип. Б. И. Соломонова, 1894. – 301 с.